аудитории СМИ, – это получение правдивой, серьезной, значимой, содержащий смысл информации. Считаться с этой потребностью аудитории – одна из важных функций СМИ, приравниваемая к общественной обязанности. Ведь общеизвестно, что журналистика должна способствовать прогрессу общества и помогать индивидуальному развитию.

*Литература*

1. Дзянгнан, Ч. Вульгарность: понимание аудиторией разницы в новостных докладах / Ченг Дзянгнан. – Хэпэй: Цэйсебиань, 2005 (на кит. яз.).

**Ларыса Цімошык**
*Газета «Літаратура і мастацтва»*

## КУЛЬТУРАСТВАРАЛЬНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СМІ

У найноўшай гісторыі беларускага грамадства сродкам масавай інфармацыі належыць асаблівая роля – актыўны ўдзел у працэсах трансфармацыі сацыякультурнай рэчаіснасці. Перажыўшы разам з грамадствам у ХХ стагоддзі розныя катаклізмы, абумоўленыя знешнімі і ўнутранымі прычынамі, беларуская прэса стала ўсведамляць і пазіцыянаваць сябе як СМІ незалежнай краіны. Адпаведна зменамі ў грамадстве і свядомасці людзей было абумоўлена змяненне адносінаў да месца, задач і функцый, якія павінны выконваць СМІ.

У новых умовах працы сродкам масавай інфармацыі сталі ўласцівыя іншыя функцыі, якія прыцягваюць увагу тэарэтыкаў друку ў постсавецкай прасторы. Вывучэнне функцый журналістыкі – асобны накірунак у яе даследаваннях. «Функцыі (лат. functio – “абавязак, прызначэнне, характар дзейнасці, выкананне абавязкаў”) журналістыкі характарызуюць сукупнасць яе абавязкаў і задач, якія яна выконвае, спосаб жыццядзейнасці ў грамадстве» [1, с. 53]. Пры гэтым СМІ разглядаюцца, з аднаго боку, як сацыяльны інстытут, які ўключае ў сябе сукупнасць іншых падсістэм, а з другога боку – як асобная сфера дзейнасці, якая мае на ўвазе сукупнасць вынікаў, якія дасягаюцца ў працэсе гэтай дзейнасці.

Уплыў СМІ на грамадства абумоўлены заканамернасцямі функцыянавання і развіцця самога грамадства. Сродкі масавай камунікацыі з’яўляюцца ўмовай забеспячэння пэўных сістэмных якасцей грамадства. Акрамя таго, уплыў абумоўлены ўласцівасцямі саміх СМІ – сутнасцю іх працы, якая задавольвае канкрэтныя інтарэсы грамадства.

Пры дапамозе катэгорыі функцыі з мноства функцыянальных сувязяў СМІ на першы план выходзяць тыя, якія з’яўляюцца першачарговымі на

дадзены перыяд часу з пункту гледжання ўдзелу СМІ ў жыцці грамадства. Яны абгрунтоўваюць і вылучаюць іншыя функцыянальныя сувязі СМІ як сацыяльнага інстытута. Функцыі СМІ ў адносінах да грамадства ўяўляюць сабой аспект свядомай, мэтазгоднай журналісцкай дзейнасці.

Найбольш падрабязна функцыі журналістыкі апісаны Б. Стральцовым і Я. Прохаравым, які вылучыў шэсць з іх: не адмовіў у праве на існаванне ідэалагічнай функцыі, таксама як і арганізатарскай (з асабліва адзначаных за савецкім часам), але ў былую савецкую сістэму функцый дадаў такія ключавыя функцыі, як камунікатыўная, інфармацыйная, а таксама рэкрэатыўная (забаўляльная), рэкламна-даведачная. Як асобную ён вылучыў культурна-адукацыйную функцыю. Усебаковае даследаванне менавіта гэтай ролі СМІ прысвяціў В. Перавалаў у дысертацыі «Культурастваральная дзейнасць журналістыкі: умовы і фактары аптымальнай рэалізацыі культурастваральных функцый СМІ». На яго думку, культура ўяўляецца краевугольным каменем, у якім засяроджаны лепшыя бакі духоўнай дзейнасці чалавека.

Культурны фактар наогул важны ў камунікацыі. Ідэнтыфікуючы сябе з пэўным этнасам і яго культурай, чалавек выпрацоўвае адносіны да акаляючага свету, разумее, дзе ў ім яго вытокі і карані. Ён ідэнтыфікуе сябе і з тэрыторыяй, на якой жыве, з тымі традыцыямі, якія прынятыя ў гэтых мясцінах. Згодна з гэтымі традыцыямі чалавек выбудоўвае адносіны з іншымі прадстаўнікамі соцыуму, утвараючы пэўную культурную прастору. З дапамогай СМІ адкрываецца магчымасць наладжвання дыялогу з рознымі соцыумамі і іх культурамі. Таму можна прыйсці да высновы, што сярод самых розных задач прэсы яе культурастваральная роля (праз здольнасць прапаноўваць на абмеркаванне грамадству розныя ідэі, выпрацоўваць шляхі вырашэння праблем, тым самым уплываць на трансфармацыю грамадства) сёння выходзіць на дамінавальную пазіцыю.

Менавіта на той падставе, што СМІ з'яўляюцца адным з інстытутаў грамадства, расійскія даследчыкі сёння вылучаюць асобную функцыю журналістыкі, якую апошнім часам сталі называць культурастваральнай, тым самым адзначаючы, што медыя ўдзельнічаюць у прапагандзе і распаўсюджанні ў грамадстве высокіх культурных каштоўнасцей, спрыяюць выхаванню асобы, узбагачаючы яе ўнутраны свет. Як з асобнага складаецца цэлае, так з асоб ствараецца грамадства, таму гэтая функцыя спрыяе павышэнню культурнага ўзроўню грамадства наогул. «Культурастваральныя функцыі ўяўляюць цэласную сістэму ў непарыўным адзінстве з усімі фактарамі, якія вызначаюць іх змест, структуру і рэалізацыю» [2].

Але на сучасным этапе мэтазгодна наогул казаць пра культурастваральную ролю журналістыкі, накіраванай як на асобнага індывіда соцыуму (выхаванне людзей на лепшых узорах сусветнай культуры, спрыянне развіццю асобы, узбагачэнне ўнутранага свету чалавека і станаўленню самадастатковай асобы), так і на ўсё чалавечае грамадства (удзел прэсы ў прапагандзе высокіх культурных узораў, фарміраванне каштоўнаснага апарату і распаўсюджанне творчага, інавацыйнага мыслення, што асабліва важна ў век высокіх тэхналогій).

Але падаецца, што культурастваральны пачатак у СМІ праяўляе сябе абсалютна ва ўсіх іх функцыях. Гэтым пачаткам прасякнута як творчая частка працы журналістаў, так і арганізацыя структуры выданняў, у якой пэўныя супрацоўнікі дбаюць пра тое, каб выданне прыходзіла да людзей, забяспечваючы камунікатыўны працэс. З гэтага пачатку чэрпаюць ідэі і тэмы журналісты, імкнучыся асэнсаваць працэсы, якія адбываюцца ў іх краіне ці ў свеце. З гэтага пачатку паходзіць і сама сістэма СМІ, у якой адно выданне дапаўняе другое, трэцяе абагульняе тое, што даносяць іншыя, чацвёртае можа даваць альтэрнатыўны пункт погляду, а пятае асэнсоўвае і стварае магчымасць роздуму для эліты, якая выпрацоўвае далейшыя шляхі развіцця грамадства.

СМІ ў дачыненні да культуры маюць высокую місію, іх ролю нельга звесці да адной функцыі. Мэтазгодна не столькі звярнуць увагу на культурастваральную функцыю СМІ, колькі разгледзець культурастваральную дзейнасць прэсы, што задае больш шырокі падыход і адпаведна дазваляе больш поўна прааналізаваць дачыненні культуры і СМІ.

Паняцце «культурастваральная дзейнасць» акрамя таго мае на ўвазе сумяшчэнне тэорыі з практыкай, выпрацоўку такіх падыходаў у працы, пры якіх будзе дасягацца больш якасны і мэтава скіраваны ўплыў СМІ на жыццё грамадства. Аналіз культурастваральнай дзейнасці СМІ дазволіць выявіць моцныя і слабыя бакі іх стасункаў з аўдыторыяй, адпаведна і выявіць накірункі, у якіх праца журналістаў можа быць больш карыснай як для асобных людзей, так і для цэлай краіны.

*Літаратура*

1. Прохоров, Е. П. Введение в теорию журналистики / Е. П. Прохоров. – М.: Аспект Пресс, 2003. – 367 с.
2. Перевалов, В. Культуроформирующая деятельность журналистики (Условия и факторы оптимальной реализации культуроформирующих функций СМИ) / В. Перевалов // Электронная библиотека диссертаций [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/ kulturoformiruyushchaya-deyatelnost-zhurnalistiki-usloviya-i-faktory-optimalnoi-realizatsii-. – Дата доступа: 09.08.2016.